Пролетары ўсіх краін, еднайцеся!

# ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 28 (97)
НЯДЗЕЛЯ
4
ЛЮТАГА
1940 г.

Цана 10 капеек

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**Масква сустракае герояў.**
Прыём у Крэмлі ўдзельнікаў гераічнага дрэйфа ледакола «Седоў».
Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Аб зацвярджэнні састава акруговых выбарчых камісій па выбарах у Совет Нацыянальнасцей ад заходніх абласцей Беларускай ССР.
**Абвяржэнне штаба Ленінградскай Военнай Акругі.**
**Па Совецкаму Саюзу.**
Гераічны экіпаж «Седова».
Прадвыбарчай агітацыяй павінна быць ахоплена ўся маса выбаршчыкаў.
Дысцыпліна ў школе.

**ЗА РУБЯЖОМ**
Разаблачэнне англа-французскіх планаў.
У Японскім парламенце.
Арышт амерыканскага карэспандэнта ў Японіі.
XX гадавіна Тартускага мірнага дагавора.



На снимке (слева направо). Капитан ледокола «Седов» **Константин Сергеевич Бадигин**, старший механик — помполит ледокола **Дмитрий Григорьевич Трофимов** и начальник экспедиции на ледоколе «И. Сталин»— Герой Советского Союза тов. **И. Д. Папанин.**

# МОСКВА ВСТРЕЧАЕТ ГЕРОЕВ

2-го февраля трудящиеся Москвы торжественно встречали участников беспримерного дрейфа на ледокольном пароходе «Седов».

Столица великой социалистической державы приготовила достойный прием героическим сынам советского народа, на славу послужившим родине, выполнившим с честью задание партии, правительства, великого Сталина. Еще накануне улицы города были празднично украшены. К прибытию поезда площадь Белорусского вокзала заполнили тысячи людей, пришедших встретить славных арктических богатырей.

...16 часов. К перону подходит поезд. Восторженным «ура» сопровождается выход седовцев из вагона. Они сразу попадают в горячие об'ятия встречающих.

Начинается митинг трудящихся Москвы, посвященный встрече экипажей ледоколов «Г. Седов» и «И. Сталин».

Митинг открывает заместитель председателя Совета Народных Комиссаров Союза ССР тов. Н. А. Булганин. По поручению Совета Народных Комиссаров Союза ССР и Центрального Комитета ВКП(б) он горячо приветствует тт. Бадигина и Трофимова и весь славный экипаж «Георгия Седова», успешно преодолевший трудности героического дрейфа в Северном Ледовитом океане. Он передает также привет тт. Папанину, Белоусову и всему замечательному экипажу ледокола «И. Сталин».

Тов. Булганин предоставляет слово секретарю МК и МГК ВКП(б) тов. А. С. Щербакову, приветствующему героических седовцев и экипаж ледокола «И. Сталин» от трудящихся Москвы. Бурными аплодисментами сопровождалось выступление капитана легендарного парохода тов. К. С. Бадигина. Затем выступил начальник экспедиции на ледоколе «Иосиф Сталин» Герой Советского Союза тов. И. Д. Папанин.

По окончании митинга седовцы, участники экспедиции на ледоколе «Иосиф Сталин» садятся в автомобили, украшенные цветами. Приветствуемые ликующим народом они направляются в Кремль. (ТАСС).

## Прием в Кремле участников героического дрейфа ледокола „Седов"

Вечером 2-го февраля в Кремле состоялся прием участников героического дрейфа ледокола «Седов», устроенный Центральным Комитетом ВКП(б) и Советом Народных Комиссаров СССР.

К 18 часам в Большом Кремлевском Дворце собрались приглашенные на прием гости — члены ЦК ВКП(б), депутаты Верховного Совета СССР и Верховного Совета РСФСР, народные комиссары, представители высшего командования РККА и Военно-Морского флота, члены семей седовцев, участники экспедиции на ледоколе «И. Сталин», видные деятели науки, техники, литературы, искусства, стахановцы московских предприятий.

С огромным под'емом, бурными, радостными овациями, возгласами приветствий встретили собравшиеся появления в зале седовцев — отважных покорителей полярной стихии.

18 часов. В зал входят тт. И. В. Сталин, В. М. Молотов, К. Е. Ворошилов, Л. М. Каганович, М. И. Калинин, А. А. Андреев, А. И. Микоян, Л. П. Берия, Н. М. Шверник, Г. М. Маленков, Н. А. Булганин, М. Ф. Шкирятов. Присутствующие восторженно приветствуют товарища Сталина и его соратников. Один за другим подходят седовцы к товарищу Сталину, который дружески, крепко жмет им руки. Тепло здороваются с седовцами руководители партии и правительства. Несколько минут длится овация.

С приветственным словом выступает Председатель Совета Народных Комиссаров СССР **В. М. Молотов.**

— Товарищи! — говорит товарищ Молотов. — В нашей среде сейчас присутствуют 15 героев Арктики, 15 героев нашей страны, совершившие беспримерный подвиг во славу нашей великой родины, во славу великой партии Ленина-Сталина.

Под бурные рукоплескания товарищ Молотов провозглашает здравицу в честь 15 советских храбрецов — славных седовцев.

Затем по предложению товарища Молотова присутствующие поднимают бокалы за команду ледокола «Иосиф Сталин», которая с честью выполнила порученное ей дело, за начальника экспедиции по выводу ледокола «Седов» тов. Папанина.

Огромный под'ем вызывают слова товарища Молотова о великой партии большевиков, под знаменем которой одержано не мало славных побед, одерживаются и будут одерживаться все новые и новые решающие победы.

— За здоровье товарища Сталина, за нашу великую партию! — провозглашает товарищ Молотов. Присутствующие стоя устраивают овацию, раздаются многочисленные возгласы приветствий в честь товарища Сталина, в честь ленинско-сталинской партии.

Товарищ Молотов предоставляет слово тов. **К. С. Бадигину.** Участники приема горячо приветствуют прославленного капитана ледокола «Седов».

— Товарищи, от имени 15 моряков - седовцев, — говорит тов. Бадигин, — разрешите поблагодарить нашу великую коммунистическую партию, Советское правительство, нашего любимого и мудрого вождя товарища Сталина за повседневное внимание, которое нам оказывалось во все время дрейфа, за исключительные заботы, которыми были окружены не только мы, но и наши семьи.

Эта поддержка и это внимание помогли победить все трудности, которые встречались на нашем пути. Внимание партии и правительства, отеческая забота товарища Сталина удесятерили наши силы, сделали нас непобедимыми.

Я провозглашаю тост за нашего Сталина! Ура, товарищи!

Мощная овация долго гремит под сводами зала. Со всех сторон слышится громкое «ура» в честь товарища Сталина.

Затем выступает тов. **Д. Г. Трофимов** — помощник капитана ледокола «Седов» по политчасти. Его встречают бурными аплодисментами. С чувством глубокого волнения благодарит тов. Трофимов руководителей партии и правительства за теплый прием.

Тов. Трофимов провозглашает тост за здоровье главы Советского правительства Вячеслава Михайловича Молотова.

Снова гремит овация.

Тепло встречают присутствующие выступление начальника экспедиции на ледоколе «Иосиф Сталин» Героя Советского Союза тов. **И. Д. Папанина.**

— Наша армия полярников, — говорит тов. Папанин, — не боится никаких трудностей и по первому зову нашего Сталина готова пойти на любые подвиги. Если партия и правительство прикажут, мы вместе с нашей любимой Рабоче - Крестьянской Красной Армией пойдем уничтожать белобандитов, палачей финского народа.

Заканчивая свою речь, тов. Папанин восклицает:

— За нашего общего народного любимца, за одного из ближайших соратников великого Сталина — маршала Советского Союза Климента Ефремовича Ворошилова!

Раздается громкое «ура» и возгласы приветствий в честь товарища Ворошилова, в честь родной, непобедимой Рабоче-Крестьянской Красной Армии.

Товарищ Молотов провозглашает здравицу в честь товарища М. И. Калинина. Присутствующие горячими аплодисментами приветствуют Председателя Президиума Верховного Совета СССР.

Прием в дружеской задушевной обстановке продолжался несколько часов. Для участников приема был дан большой концерт. (ТАСС).

# УКАЗ

## *Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР*

### АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ САСТАВА АКРУГОВЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ ПА ВЫБАРАХ У СОВЕТ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ АД ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЕЙ БЕЛАРУСКАЙ ССР*)

Зацвердзіць Акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей у саставе наступных прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных:

БЕЛАСТОЦКАЯ АКРУГОВАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 581

Старшыня — **Сямёнаў Гаўрыіл Іванавіч** — ад комуністычнай арганізацыі горада Беластока.

Нам. старшыні—**Шышкін Якаў Канстанцінавіч** — ад арганізацыі Асоавіяхіма Беластоцкай вобласці.

Сакратар — **Гірко Нікалай Сямёнавіч** — ад комсамольскай арганізацыі горада Беластока.

Члены: **Чэрнышова Таццяна Міхайлаўна** — ад рабочых і служачых чыгуначнікаў горада Беластока.

**Малыгін Васілій Акімавіч** — ад комуністычнай арганізацыі чыгуначнага вузла горада Беластока.

Гецэвіч Антон Карлавіч — ад рабочых і служачых вагонарамонтнага завода станцыі Лапы.

**Канановіч Нікалай Антонавіч** — ад рабочых і служачых Міхайлаўскага тэкстыльнага камбіната.

**Баршчэўскі Іосіф Івановіч** — ад комуністычнай арганізацыі Заблудаўскага раёна.

**Максімлюк Еўдакія Фёдараўна** — ад сялянскага камітэта в. Новая Воля, Беластоцкага раёна.

**Юроўчык Аляксандр Пятровіч** — ад сялянскага камітэта в. Дуброўка, Беластоцкага раёна.

**Хомчык Нона Сцяпанаўна** — ад рабочых чыгуначнага дэпо станцыі Старасельцы.

ГРОДНЕНСКАЯ АКРУГОВАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 582

Старшыня — **Тарасаў Гаўрыіл Фёдаравіч** — ад комуністычнай арганізацыі горада Гродна.

Нам. старшыні—**Осіпава Лідзія Іванаўна** — ад рабочых і служачых табачнай фабрыкі горада Гродна.

Сакратар—**Кадышэвіч Фейга Абрамаўна** — ад прафесіянальнага саюза гарбароў горада Гродна.

Члены: **Семянчук Андрэй Грыгор'евіч** — ад рабочых і служачых гумавай фабрыкі горада Ліды.

**Вараб'ёў Мацвей Федасеевіч** — ад арганізацыі Асоавіяхіма горада Гродна.

**Врублеўскі Станіслаў Іосіфовіч** — ад рабочых і служачых смалакуранага завода горада Ліды.

**Дземех Лубоў Данілаўна** — ад Дамброўскага сялянскага камітэта.

**Юшко Іван Міхайлавіч** — ад інтэлігенцыі Шчучынскага раёна.

**Смаршко Ніна Віктараўна** — ад рабочых і служачых цэментнага завода горада Валкавыска.

**Крук Сцяпан Леонцьевіч** — ад рабочых і служачых дэпо станцыі Валкавыск.

**Зіноўка Станіслаў Осіпавіч** — ад сялянскага камітэта в. Лебедзін, Саколкаўскага раёна.

**Нам. Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР**
**С. МЕЛЬНІКАЎ**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР**
**Л. ПАПКОЎ.**

1-га лютага 1940 г.
Мінск.

*) Друкуюцца толькі выбарчыя акругі па Беластоцкай абласці.

# ОПРОВЕРЖЕНИЕ ШТАБА ЛЕНИНГРАДСКОГО ВОЕННОГО ОКРУГА

1) Купленные агенты врагов СССР распространяют в иностранной печати, что «финские самолеты совершили рейд в районы СССР и бомбардировали в Кронштадте советские военные корабли, которые горят» и т. п. Штаб заявляет, что все эти слухи представляют сплошной вымысел. Финская авиация, несмотря на то, что она «получила новейшие самолеты из Англии, Франции, США Швеции, Италии», не только не предпринимала «рейда», но оказалась неспособной защитить командные пункты финских штабов в **Лахти,** в **Рованиеми,** в **Сортавала,** в **Выборге,** которые разбиты советской авиацией. [illegible] ции в сторону Кронштадта или какую-либо другую сторону в районах СССР не было и не могло быть.

2) Те же платные агенты врагов СССР утверждают в иностранной печати, что «на Карельском перешейке и в районе севернее Ладоги началось большое наступление советских войск. перспективы которого еще не ясны». Штаб заявляет,что это утверждение также лишено всякого основания. На самом деле на Карельском перешейке и в районе севернее Ладоги имеют место лишь частичные столкно[illegible] мые непродолжительной артиллерийской перестрелкой. Возможно, что с точки зрения микроскопических масштабов операций западного фронта в Европе столкновение нескольких рот кажется «большим наступлением». Но нам кажутся такие масштабы смешными и мы не можем считать столкновение нескольких рот ни большим, ни малым наступлением.

(ТАСС).

## ОПЕРСВОДКА ШТАБА ЛЕНИНГРАДСКОГО ВОЕННОГО ОКРУГА

В течение 2-го февраля на фронте не произошло ничего существенного.

Наша авиация произвела успешную бомбардировку военных объектов противника. В воздушных боях сбито 11 самолетов противника. Из нашей авиации не вернулся на свой аэродром один самолет.

# ПА СОВЕЦКАМУ САЮЗУ

## КАЛЬЦАВЫ МАРШРУТ ПАРАВОЗАЎ

Да гэтага часу паравозы Мінскага дэпо вадзілі саставы па маршрутам Мінск — Барысаў і Мінск — Маладзечна. Паравозы, як правіла, пасля звароту з Барысава і Маладзечна заходзілі ў дэпо, набіралі вугаль і вялікую колькасць часу прастойвалі. Зараз па ініцыятыве машыніста - ордэнаносца тав. Багацеля арганізавана кальцавая язда па лініі Мінск — Барысаў — Маладзечна— Мінск. Гэта значыць, што паравоз вядзе састаў да Барысава, адтуль бярэ новы састаў і вядзе прама да Маладзечна, без астаноўкі для набора вугалю ў Мінску. З Маладзечна паравоз варочаецца ў Мінск з новым саставам. Гэта дае вялікую эканомію ў скарыстанні паравознага парка, павялічвае абарот паравозаў, змяншае час следавання саставаў і інш.

(БЕЛТА).

## ВЫПУСК МАЛОЧНЫХ ВЫРАБАЎ НА УКРАІНЕ

Прадпрыемствы мяса-малочнай прамысловасці Украіны значна павялічылі выпуск малочных вырабаў. У мінулым годзе было выпрацавана 27.700 тон жывёльнага масла, 2.100 тон сыроў, 179.700 тон усялякіх малочных прадуктаў і 4.500 тон марожанага. У 1940 годзе прадпрыемствы дадуць 30.000 тон масла, 2.500 тон сыроў, 194.200 тон малочных прадуктаў і 5.000 тон марожанага.



Радасна жыве сялянская моладзь. На здымку: Дзяўчаты вёскі Тыльвіца, Беластоцкага раёна.

## ПАДРЫХТОЎКА ДА НОВАГА ТОРФСЕЗОНА

**Смалявічы.** (БЕЛТА). На торфзаводах «Чырвоны сцяг» і імені Орджанікідзе шырока разгорнута падрыхтоўка да новага торфсезона. На заводзе «Чырвоны сцяг» адрамантавана 3 гідраэлеватарных машыны, скрэпер, падрыхтоўваюцца балотныя масівы. Раскарчавана 124 гектары балот. Заключана 230 дагавораў з рабочымі.

На заводзе імені Орджанікідзе заканчваецца рамонт трактароў, адрамантавана адна элеватарная машына. Пры заводзе арганізаваны курсы трактарыстаў і параўшчыкаў, на якіх займаецца 144 чалавекі. Заключаны першыя 280 дагавораў. Для рабочых будуецца 16-кватэрны дом.

## БУДАЎНІЦТВА ДРУГОЙ ЧАРГІ ГЭС—2 У МІНСКУ

Закончана састаўленне тэхнічнага праекта другой чаргі Мінскай ГЭС—2. Новая цеплаэлектрастанцыя магутнасцю ў 7 тысяч кіловат электраэнергіі і 70 тыс. тон пара ў гадзіну будзе пабудавана ў раёне Ляхаўкі. Яна абслужыць прамысловы раён і цэнтральную частку горада.

Зараз на будаўнічай пляцоўцы вядуцца падрыхтоўчыя работы. Завозіцца неабходны матэрыял, пачата будаўніцтва падсобных памяшканняў, інтэрната, жылога дома. Для новай станцыі закончана магутная турбіна і генератар.

Каштоўнасць будаўніцтва — 13 мільёнаў рублёў. Асноўныя работы і мантаж абсталявання павінен быць закончан да канца гэтага года.

(БЕЛТА).

## ЖАНЧЫНЫ ТАДЖЫКІСТАНА СУПРОЦЬ ПАРАНДЖЫ

Жанчыны Таджыкістана горача падтрымліваюць прапанову дэпутата Вярхоўнага Совета СССР тав. Мастуры Авезавай аб выданні закона, забараняючага насіць паранджу. На шматлюдных сходах, прысвечаных гэтаму пытанню, жанчыны-таджычкі патрабуюць рашучай барацьбы з феадальна-байскімі адносінамі да іх.

Днямі адбыўся сход жанчын Пенджыкента. Ён пастанавіў прасіць урад выдаць закон супроць паранджы. 20 таджычак, удзельніц гэтага схода, знялі паранджу.

# ГЕРАІЧНЫ ЭКІПАЖ „СЕДОВА“



[illegible] экипаж ледокола «Георгий Седов». Верхный ряд: (слева направо) капитан К. С. Бадигин, старший помощник капитана А. Г. Ефремов, гидрограф В. Х. Буйницкий, старший радист А. А. Полянский и помполит и старший механик Д. Г. Трофимов. Средний ряд: (слева направо) радист Н. М Бекасов, доктор А. П. Соболевский, второй механик С. Д. Токарев и третий механик В. С. Алферов. Нижний ряд: (слева направо) повар П. В. Мегер, машинист Н. С. Шарыпов, боцман Д. П. Буторин, кочегар И. И. Гетман, матрос Е. И. Гаманков и машинист И. М. Недзвецкий.

## КАПІТАН - БОЛЬШЭВІК

— Я сайду з барта „Седова“ толькі тады, калі ён закончыць дрэйф і прышвартуецца ў совецкім парту.

Так заявіў у жніўні 1938 года Канстанцін Сяргеевіч Бадзігін — капітан дрэйфуючага карабля — на прапанову змяніцца.

Канстанцін Сяргеевіч Бадзігін нарадзіўся ў 1910 годзе ў Пензе, у сям'і агранома — выхадца з сялян.

Ажыццяўляючы мару дзяцінства, Канстанцін Бадзігін у 1928 годзе па пуцёўцы ЦК ВЛКСМ паступае ў ваенна-марское вучылішча імені Фрунзе, але па сямейных акалічнасцях прарывае вучобу і паступае такелажнікам на фабрыку „Красный водник“.

На фабрыцы ён пазнаёміўся з маракамі Далёкаўсходняга флота, Бадзігін, параіўшыся з новымі прыяцелямі, пераязджае ў Владзівасток. У 1929 годзе яго залічаюць матросам другога класа на параход „Индигирка“.

Малады марак хутка асвоіўся на караблі, выдатна выканаў заданне камандзіра. Ён сур'ёзна бярэцца за вучобу і самастойна рыхтуецца да здачы экзаменаў на другі курс Владзівастоцкага марскога тэхнікума. У 1932 годзе ён адным з першых канчае тэхнікум. У гэтым жа годзе ён уступае ў рады ВКП(б).

Прадаўжаючы ўдасканальвацца ў штурманскай справе, тав. Бадзігін плаваў на розных лесавозах і танкерах. Ён пабываў у Сінгапуры, Гамбургу, Ротэрдаме, Лондане..

Горача адклікаецца Бадзігін на заклік Цэнтральнага Камітэта ВЛКСМ аб ператварэнні ледакола „Красин“ у комсамольскі карабль. Тут Бадзігіна вылучаюць трэцім памочнікам капітана, а ў хуткім часе — другім памочнікам. За Бадзігіным замацоўваецца слава вопытнага суднавадзіцеля, актыўнага комуніста, выдатнага таварыша. [illegible] пераводзяць старшым памочнікам на ледакол „Садко“.

Восенню „Садко“ разам з „Седовым“ і „Малыгиным“ быў зацёрт ільдамі, а вясной, калі захварэўшага капітана „Седова“ вывезлі на самалёце з дрэйфуючага карабля, Канстанціна Сяргеевіча назначылі камандзірам „Седова“.

## ПАРТЫЙНЫ АРГАНІЗАТАР

У 1924 годзе 18-гадовым юнаком пачаў сваю карабельную службу Дзмітрый Грыгор'евіч Трафімаў — помпаліт і старшы механік ледакола „Седов“. Скончыўшы ў родным горадзе Срэценску (Чыцінская вобласць) чыгуначную школу-сямігодку, ён, сын рабочага дэпо, працуе матросам на параходзе Амурскага басейна.

У 1929 годзе Трафімаў паступіў у Благавешчанскі водны тэхнікум, адкуль скора ўшоў у Ціхаакіянскі гандлёвы флот. Свой першы марскі рэйс ён зрабіў качагарам на параходзе „Волна“.

У 1931 годзе Трафімаў — качагар парахода „Томск“. У тым-жа годзе ён уступае ў партыю. У наступным годзе Дзмітрый Трафімаў працуе машыністам параходаў „Красный партизан“ і „Сучан“. Ужо на „Сучане“ Трафімаў вядзе вялікую работу — узначальвае комуністычную арганізацыю.

Перадавога работніка на вытворчасці, комуніста Трафімава накіроўваюць на ледарэз „Литке“, перад экіпажам якога была пастаўлена задача — упершыню ў гісторыі мораплавання прайсці Паўночны марскі шлях з усхода на захад за адну навігацыю.

Перадавікі „Літке“ былі ўзнагароджаны ордэнамі Совецкага Саюза. У іх ліку быў Дзмітрый Грыгор'евіч Трафімаў. Ён атрымаў ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Яго пераводзяць чацвертым механікам на ледакол „Ермак“. Трафімаў прымае ўдзел у рэйсе „Ермака“ к папанінцам і ў выдатным высокаширотным рэйсе к каравану дрэйфуючых суднаў. Калектыў „Ермака“ паслаў Трафімава на ледакол „Седов“.

На „Седове“ Дзмітрый Грыгор'евіч правёў велізарную работу, па-большэвіцку мабілізаваў калектыў ледакола на барацьбу з труднасцямі за паспяховае скончанне дрэйфа.

## АДВАЖНЫ ВУЧОНЫ - ДАСЛЕДЧЫК

Велізарную навукова-даследчую работу правёў калектыў „Седова“ ў дні свайго небывалага дрэйфа. Душой гэтай работы, ініцыятарам многіх найцікавейшых назіранняў быў малады вучоны комсамолец Віктар Харлампіевіч Буйніцкі.

Ледакол „Садко“, на якім першапачаткова праводзіў свае навуковыя работы тав. Буйніцкі, трымаў курс на ўсход. Буйніцкі ўпершыню зрабіў магнітную з'ёмку вострава Генрыета, дзе пасля экспедыцыі Дэ-Лонга ніхто не быў. Там-жа ён вызначыў элементы зямнога магнетызма, зрабіўшы для гэтага цяжкі паход на вяршыню купала-падобнага ледніковага пакрова. Буйніцкі правёў цэлую серыю навуковых назіранняў на астравах Жанеты, Бене- [illegible]

На „Седове“ ён бліскуча арганізаваў і ўзначаліў каштоўнейшыя работы, якія з'яўляюцца буйным укладам у перадавую совецкую навуку.

## СНАЙПЕРЫ ЭФІРА

Паспяховай рабоце радыёстанцыі „Седова“ ў значнай ступені спрыяў багаты палярны вопыт Аляксандра Аляксандравіча Палянскага, які з'яўляецца старшым радыстам „Седова“.

Яго жыццёвы шлях непарыўна звязан з морам, з Паўночным. У 1921 годзе Аляксандр Аляксандравіч, працуючы ў службе сувязі Белага мора, заканчвае радыёшколу, набывае кваліфікацыю радыётэлеграфіста палярніка.

Палянскі перайшоў на борт „Седова“ ў 1936 годзе праслаўленым ужо майстрам радыёсувязі „снайперам эфіра“. З першых-жа дзён ён заваяваў аўтарытэт і любоў усяго экіпажа. Палянскі моцна прывязаўся да судна, і калі ў жніўні 1938 года яму прапанавалі, калі пажадае, пакінуць „Седов“ і перайсці на „Ермак“, ён адказаў рашучым адмаўленнем.

* * *

Усе добра ведаюць Нікалая Міхайлавіча Бекасава — аўтара шматлікіх карэспандэнцый аб легендарным дрэйфе. Толькі за восем месяцаў — з верасня 1938 года па май 1939 года ён разам з тав. Палянскім перадаў і прыняў 4.400 тэлеграм — амаль 168 тысяч слоў.

Нікалаю Міхайлавічу Бекасаву ў лістападзе споўнілася 26 год. Ён вышаў з сялянскай сям'і. Скончыўшы 6 класаў пачатковай школы, у 1929 годзе ён перайшоў у Ленінградскую школу фабрычна-заводскага вучнёўства папернікаў. З 1931 года Бекасаў у комсамоле. З школы ФЗВ ён ідзе працаваць падручным механікам на ленінградскі завод „Геологоразведка“. Яго цягне да работы на моры. Ён паступае на радыёаддзяленне Ленінградскага марскога тэхнікума і ў 1937 годзе заканчвае вучобу. Летам 1938 года ў якасці радыста ледакола „Ермак“ Бекасаў адпраўляецца ў далёкае арктычнае плаванне. З гэтага карабля ён перайшоў у радыёрубку „Седова“ — тую самую радыёрубку, з якой у апошнія дні дрэйфа і перадаў сваім родным і прыяцелям радасную радыёграму:

— Ідзем дамоў. Рад скора ўсіх вас убачыць і абняць. Рад, што мы, седоўцы, справіліся з заданнем партыі і ўрада, з заданнем вялікага Сталіна.

Аляксандр Пятровіч Сабалеўскі — выдатны таварыш. Яго заўсёды бачылі на аўральных работах. З лапатай, з сякерай у руках ён з'яўляўся на самых небяспечных участках. У свабодныя мінуты ён перадаваў таварышам свае веды. Выкладанне агульнаадукацыйных прадметаў маракам „Седова“ было яго любімым заняткам.

Аляксандр Пятровіч Сабалеўскі нарадзіўся ў горадзе Гарадок, Беларускай ССР. Тамжа ён атрымаў пачатковую асвету. У 1920 годзе Аляксандр Сабалеўскі паступіў у профтэхнічнае вучылішча, якое паспяхова закончыў у 1924 годзе. Затым — служба ў адной з пагранічных часцей, вучоба ў медыцынскім інстытуце, работа ў Гідраграфічным упраўленні Галоўнага ўпраўлення Паўночнага марскога шляху. Затым яго назначаюць выконваючым абавязкі ўрача ў вялікай гідраграфічнай экспедыцыі на „Седове“.

## ВЫДАТНЫ НАВІГАТАР

Андрэй Георгіевіч Ефрэмаў нарадзіўся ў 1908 годзе ў сям'і служачага ў горадзе Срэценску (Чыцінская вобласць). Атрымаўшы пачатковую асвету, ён паступіў у Владзівастоцкі марскі тэхнікум. Праходзячы вытворчую практыку, Ефрэмаў пачынае працаваць спачатку вучнем, а затым матросам на караблях гандлёвага флота, прымае ўдзел у дальніх плаваннях.

Праслужыўшы каля года ў Чырвонай Арміі, Андрэй Георгіевіч накіроўваецца ў Ленінград. Тут ён вучыцца ў інстытуце інжынераў воднага транспарта, у ліпені 1933 года з дыпломам інжынера-педагога па марскому суднаваджэнню вяртаецца на Далёкі Ўсход.

З чэрвеня 1935 года — ён другі памочнік капітана на ледаколе „Красин“. Тут ён сустрэўся з Бадзігіным, тут пачалася іх дружба, змацаваная затым доўгімі месяцамі сумеснага прабывання ў Арктыцы.

З 1937 года Андрэй Георгіевіч Ефрэмаў перайшоў старшым гідрографам навуковай групы на ледакольны параход „Малыгин“, які адправіўся ў далёкую арктычную экспедыцыю. Калі „Малыгин“ з дапамогаю „Ермака“ выходзіў з дрэйфа, Андрэй Георгіевіч перайшоў на борт „Седова“.

## «ЭКІПАЖ ЗДАРОЎ»

Радыётэлеграмы, паступаўшыя на вялікую зямлю з ледакола „Седов“, нязменна заканчваліся так:

— Экіпаж здароў і бадзёры.

Здароўе і бадзёрасць экіпажа — у значнай меры результат самаадданай працы суднавога ўрача Аляксандра Пятровіча Сабалеўскага.

## СТОЙКАСЦЬ І САМААФЯРАВАННЕ

Параходы і водныя шляхі з дзяцінства былі знаёмы Сяргею Дзмітрыевічу Токарэву — другому механіку ледакола „Седов“. Ён нарадзіўся ў 1906 годзе на беразе Волгі, у горадзе Вольску, у сям'і рабочага.

Восенню 1928 года Сяргея Токарэва прызвалі ў Ваенна-Марскі флот.

Пасля дэмабілізацыі, у 1931 годзе, Токарэў пераязджае ў Архангельск і паступае машыністам на ледакол „Ленин“. У кастрычніку 1936 года ён пачынае працаваць старшым машыністам на ледаколе „Седов“, адкуль яго пераводзяць на „Садко“. Калі „Ермак“ вызывае „Садко“ і „Малыгина“ з лёдавага палону, Токарэў без хістанняў пераходзіць на борт „Седова“. На доўгія месяцы герой-механік звязвае свой лёс з дрэйфуючым суднам, праяўляючы стойкасць і рашучасць, імкненне дасягнуць пераможнай мэты.

## КОМСАМОЛЕЦ АЛФЕРАЎ

У цяжкі 1920 год, калі белагвардзейскі атрад набліжаўся да глухой вёскі Шэнкурскага павета, маці Всевалада Алферава пайшла да партызанаў і з вінтоўкай у руках абараняла маладую Совецкую рэспубліку. Застаўшыся старшым у сям'і, трынаццацігадовы Всевалад Алфераў стаў зарабляць на лесараспрацоўках для трох сваіх малодшых братоў.

З 1928 года ён неразрыўна звязан з марскім флотам. Ён працуе качагарам на траулерах „Камбала“, „Навага“, „Окунь“, на параходах „Аркос“, „Мироныч“, „Сорока“, „Пушкин“. З сакавіка 1933 года ён — у арктычным флоце, спачатку на „Сибирякове“, а затым — на „Седове“. Ён прывязваецца к караблю, расце тут, атрымлівае кваліфікацыю машыніста і механіка.

Летам 1939 года Алфераў разам з іншымі механікамі зрабіў пераборку механізмаў „Седова“, падрыхтаваў іх да беспрабойнай работы пасля выхаду з дрэйфа, самаадданa працаваў, выпраўляючы рулявое ўпраўленне ледакола.

Дні дрэйфа былі для яго сур'ёзнай школай.

## АДВАЖНЫ СЫН МОРА

Любоў да мора, да поўначы Дзмітрый Пракоф'евіч Буторын унаследваў ад свайго бацькі памора.

Чатырнаццаці год пайшоў ён разам з бацькам за рыбай і марскім зверам. Восем год прамышляў Дзмітрый Буторын рыбу і марского звера.

У 1927 годзе Буторын перайшоў з карбаса на вялікі ледакольны параход. Ён плавае на „Сибирякове“, на „Русанове“, на „Седове“. Усё новыя раёны поўначы пазнае назіральны марак. Яго нястрымна цягне ў новыя паходы.

У 1930 годзе Буторын прызываецца ў Чырвоную Армію. Пасля дэмабілізацыі, у сакавіку 1933 года, ён зноў паступае матросам на „Седов“.

Боцман „Седова“ Дзмітрый Буторын — майстар на ўсе рукі.

Стойкім, здольным пераадалябаць любыя труднасці паказаў сябе ў дні дрэйфа Дзмітрый Пракоф'евіч Буторын — адважны сын мора.

## ВЫХАВАНЕЦ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Машыніст першага класа ледакольнага парахода „Седов“ Іосіф Маркавіч Недзвецкі нарадзіўся ў сям'і беднага селяніна. Выдатную ролю ў яго жыцці адыграла Чырвоная Армія, якая выхавала ў ім выдатныя якасці — самаадданасць, любоў да сваёй радзімы, мужнасць і адвагу. Яна-ж дала яму кваліфікацыю матарыста.

Рэпутацыю лепшага стаханаўца-выдатніка атрымлівае Іосіф Маркавіч Недзвецкі ў дні звышраннягa рэйса ледакола „Ермак“ да берагоў зямлі Франца Іосіфа. Бліскуча выканаўшы і гэту аперацыю, „Ермак“ трымае шлях да заціснутых у ільдах ледакольных параходаў „Садко“, „Седов“ і „Малыгин“. У дні выдатных паходаў „Ермака“ Іосіф Маркавіч Недзвецкі працуе самаaддана і геараічна, забяспечваючы паспяховае завяршэнне рэйса. Калі высняецца неабходнасць далейшага дрэйфа „Седова“, ён пераходзіць з „Ермака“ на дрэйфуючы карабль.

## ШЭСЦЬ ГОД НА «СЕДОВЕ»

Нікалай Сяргеевіч Шарыпаў нарадзіўся ў Архангельску ў 1915 годзе ў сям'і каваля фабрыкі „Канат“. Нікалай Шарыпаў у 1933 годзе скончыў школу марскога вучнёўства, дзе атрымаў спецыяльнасць машыніста і слесара.

Жыццё на поўначы загартавала маладога марака, выхавала ў ім смеласць, ініцыятыву. Ён паступіў на ледакольны параход „Седов“, ужо маючы вялікі вопыт плавання ў паўночных марах. Самы малады ў геараічным экіпажы дрэйфуючага карабля, ён разам з тым — адзін са старэйшых седоўцаў.

Больш шасці год Шарыпаў — на легендарным ледаколе. Ён напружыў усе свае сілы, каб захаваць машыны, катлы і ўсе механізмы „Седова“.

## ПОВАР, МАРАК, МАСТАК

Павел Власавіч Мегер — патомствены повар-марак. Ён нарадзіўся ў 1912 годзе ў Одэсе, у сям'і кока чарнаморскага флота. З дзяцінства ён палюбіў мора і быў зачынішчыкам многіх „марскіх падарожжаў“. 16 год ён ужо знаходзіўся ў одэскім вучылішчы плаўсастава. Тут-жа ў 1929 годзе ўступіў у комсамол. У 1930 годзе тав. Мегер скончыў вучылішча і пачаў працаваць у чорнаморскім параходстве ў якасці матроса, затым качагара.

У чэрвені 1938 года тав. Мегер паступае камбузнікам на старэйшы ледакол арктычнага флота „Ермак“. Тут ён набывае прафесію повара, якая потым так прыгадзілася яму ў дні выдатнага дрэйфа „Седова“.

Павел Власавіч мае яшчэ адну „спецыяльнасць“: ён здольны мастак — у гадзіны дасуга ён запаўняе свой альбом зарысоўкамі, адлюстроўваючымі жыццё на „Седове“.

## ЛЯ ТОПАК КАРАБЛЯ

Калі ледакол „Седов“ рашано было пакінуць у дрэйфе, у ліку лепшых людзей „Ермака“ на борт дрэйфуючага карабля перайшоў качагар 1-га класа Іван Іванавіч Гетман. Паказваючы прыклад спакою і бясстрашша, тав. Гетман выдатна выконваў любыя суднавыя работы.

Гэты мужны чалавек нарадзіўся ў 1913 годзе ў горадзе Нежыне, у сям'і столяра-чырвонадрэўшчыка. Упершыню ён пазнаёміўся з суровай Арктыкай на Шпіцбергене, дзе працаваў на совецкіх вугальных копях землякопам, грузчыкам, манцёрам. У 1936 годзе пасля добраахвотнай службы ў Чырвонай Арміі комсамолец Гетман працуе ў Ленінградскім гандлёвым парту, у лютым 1938 года пераязджае ў Мурманск і ў тым-жа годзе на старэйшым ледаколе „Ермак“ адпраўляецца на поўнач — да „Седова,“ з якім прарабіў бяспрыкладны шлях у дрэйфуючых ільдах.

## МАТРОС ПЕРШАГА КЛАСА

Матрос першага класа дрэйфуючага ледакола „Седов“ Ефрэм Іванавіч Гаманкоў можа ўспомніць дзесяткі эпізодаў з дзён сваёй службы ў лоцманскай дыстанцыі Белага мора. Гэта служба загартавала яго, зрабіла храбрым, валявым чалавекам.

З „Ермаком“ Ефрэм Іванавіч ідзе да зазімаваўшага ў ільдах „Седова“ і ў ліку 6 храбрацоў-палярнікаў пераходзіць на борт дрэйфуючага ледакола. У жорсткую сцюжу дапамагае ён праводзіць складанейшыя навуковыя назіранні. У дні, калі ледаколу пагражае гібель, Гаманкоў бясстрашна пераносіць аварыйныя запасы з адной ільдзіны на другую. Не раз прыходзілася яму выконваць сваю работу ў лёдавай вадзе, рызыкуючы здароўем і нават жыццём.

# ПРАДВЫБАРЧАЙ АГІТАЦЫЯЙ ПАВІННА БЫЦЬ АХОПЛЕНА ЎСЯ МАСА ВЫБАРШЧЫКАЎ

## АГІТАТАРЫ РАЗГАРНУЛІ РАБОТУ Ў ВЁСКАХ

Прадвыбарчая работа ў Заблудаўскім раёне разгортваецца ўсё шырэй і шырэй. Райком партыі накіраваў у вёску адказных работнікаў, якія праводзяць сялянскія сходы, прысвечаныя вылучэнню членаў участковых выбарчых камісій. У члены ўчастковых выбарчых камісій сяляне пасылаюць самых адданых совецкай уладзе людзей.

Зараз у раёне працуюць *1000 агітатараў. Яны праводзяць гутаркі з сялянамі,* растлумачваюць Сталінскую Канстытуцыю і выбарчы закон.

30 і 31 студзеня райком партыі арганізаваў лыжны агітпаход, у якім прынялі ўдзел больш 50 агітатараў. У часе пахода агітатары правялі ў 30 вёсках гутаркі з сялянамі аб Сталінскай Канстытуцыі і Палажэнні аб выбарах. Удзельнікі лыжнага пахода ва ўсіх вёсках, дзе яны пабывалі, арганізавалі гурткі па вывучэнню Канстытуцыі СССР і БССР і выбарчага закона.

У вёсцы Баршчэва гуртком па вывучэнню Канстытуцыі кіруе т. Лешчук. Заняткі гуртка наведвае больш 60 сялян. У вёсцы Азяблы гурткамі кіруюць агітатары тт. Суркоў і Леўшын.

У бліжэйшыя дні райком склікае 3-дзённыя курсы агітатараў у Міхайлаве, Суражы, Гарадку і іншых населеных пунктах з ахопам 1000 чалавек.

Міхайлава — цэнтр акруговай выбарчай камісіі. Тут працуюць *68 агітатараў, Агітатар* тав. Гуртнік Екацерына ў гуртку, якім яна кіруе, арганізавала чытку даклада таварыша Сталіна на VIII Надзвычайным з'ездзе Советаў СССР.

Арганізаваны і працуюць 4 гурткі па вывучэнню Канстытуцыі і выбарчага закона ў мястэчку Сураж. Сяляне Суража ўзялі на сябе абавязацельства ў чэсць дня выбараў пабудаваць мост праз раку Нарэў, узорна падрыхтавацца да веснавой сяўбы.

**Г. Майскі.**

## ЛЕПШЫХ ЛЮДЗЕЙ — У ЧЛЕНЫ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ

